УДК 9 (476) (1921 – 1939 гг.)

# ЛІКВІДАЦЫЯ СЕРВІТУТА У ЗАХОДНЕБЕЛАРУСКАЙ ВЕСЦЫ У 1921-1939 ГГ.

С.М. Грэсь, к. гістар. н.
Кафедра гуманітарных дысцыплін
УА «Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт»
Тэхналагічны каледж
УА «Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Я. Купалы»

*У артыкуле разглядаюцца праблемы, звязаныя з ліквідацыяй сервітутнага права ў Заходняй Беларусі ў міжваенны перыяд. Актуальнасць такой пастаноўкі пытання цалкам зразумелая па некалькіх прычынах. Па-першае, у II Рэчы Паспалітай яны з'яўляліся перажыткамі даўно мінулых часоў, што тармазіла развіццё капіталізма ў сельскай гаспадарцы; па-другое, таксама відавочным з'яўляецца той факт, што ліквідацыя сервітутаў была накіравана на мацаванне польскага ўплыву ў заходнебеларускім рэгіёне; па – трэцяе, у чым прычына таго, што заходнебеларускае сялянства не хацела дабраахвотна адказвацца ад іх.*

*Дадзены артыкул разглядае гэту праблему, зыходзячы менавіта з гэтых прычын. На аснове архіўнага матэрыялу разглядаюцца працэсы ліквідацыі сервітутаў на тэрыторыі Заходняй Беларусі.*

***Ключавыя словы:** сервітуты, Заходняя Беларусь.*

*The article deals with the problem of elimination of servitude law in Western Belarus during the interwar period. The reasons for discussing the problems are evident. Firstly, in Rzecz Pospolita they were the survivals of the past, which hindered the development of capitalism in agriculture; secondly, it is clear that the elimination of servitudes was aimed at strengthening of Polish influence in western region of Belarus; thirdly, what was the reason why the peasants of western Belarus didn't wish to reject them on their own good will.*

*The given article deals with this problem taking into account these reasons. The process of servitude law elimination in western Belarus is discussed on the basis of archive materials.*

***Key words:** servitude, western Belarus.*

## Уводзіны

Адной з галоўных задач у сельскай гаспадарцы для міжваеннай Польшчы была праблема аграрнага крызісу ў вёсцы, у тым ліку і заходнебеларускай. Вырашэнне гэтага пытання для польскай дзяржавы было неабходна з прычыны ўладкавання адносін паміж далучанымі тэрыторыямі Заходняй Беларусі і новымі органамі ўлады.

Адной з форм перажыткаў з'яўлялася сервітутнае права. Яго ліквідацыя была відавочнай для сельскай гаспадаркі Рэчы Паспалітай міжваеннага часу. На першы погляд, імкненне ліквідаваць сервітуты азначала развіццё капіталістычных адносін у вёсцы, уцягванне сялянскіх гаспадарак у таварна-грашовыя адносіны, паскарэнне тэмпаў пераўзбраення і як след павелічэнне прыбытковасці такіх гаспадарак. Аднак сродкі, з дапамогай якіх гэта рэформа павінна была праводзіцца, былі непрымальнымі для заходнебеларускага насельніцтва.

На сённяшні дзень большасць даследаванняў па гэтай праблеме напісаны яшчэ ў 70-я гады XX ст. і ў многім падаюць пункт гледжання таго часу. Акрамя таго, яны абмежаваны перыядам 1921-1925 гг. і не разглядаюць працяг рэформ пасля майскага 1926 г. перавароту Ю. Пілсудскага. Да такіх даследаванняў адносяцца працы А.А. Сарокіна [8], Б.Я. Кухарава [7]. У польскай гістарычнай літаратуры існуе значна больш даследаванняў, прысвечаных аграрным пераўтварэнням у II Рэчы Паспалітай, аднак яны разглядаюць праблему ліквідацыі сервітутаў на заходнебеларускіх як цалкам дадатны момант аграрнай рэформы і не акцэнтуюць увагі на праблемах з якімі сутыкнулася насельніцтва далучаных тэрыторый.

У сённяшняй айчыннай гістарыяграфіі няма даследаванняў, якія тычацца гэтай праблематыкі. Дадзены артыкул – гэта спроба разгляду дадзенай рэформы з пазіцый сённяшняга дня. Ён падрыхтаваны на аснове вывучэння архіўных крыніц, якія знаходзяцца на тэрыторыі Беларусі ў Дзяржаўных абласных архівах Гродна, Брэста, а таксама польскіх статыстычных зборнікаў.

Такім чынам, існуе як гістарычная праблема, якая патрабуе пільнай увагі навукоўцаў, так і слаба даследаванае кола гістарычных крыніц, што робіць разгляд гэтай праблематыкі дастаткова актуальным.

## Асноўная частка

Нягледзячы на пачатак рэформ, у Польшчы назіраўся шэраг феадальных перажыткаў. У першую чаргу гэта датычылася сервітутнага права. Сервітут – гэта права на сумеснае карыстанне пэўным зямельным надзелам (часцей за ўсё гэта былі выганы, кустарнікі, выпасы), якія належылі дзвюм

і больш асобам. Гісторыя фарміравання сервітутаў пачыналася ў той час, калі ў сялян не было асабістай уласнасці на зямлю і сялянская жывёла магла пасвіцца па лугах і ў лясах, якія належылі памешчыкам.

У міжваеннай Польшчы сервітуты існавалі толькі ў той частцы, якая раней уваходзіла ў склад Расійскай імперыі. Праблема прыналежнасці гэтых земляў стаяла заўсёды востра. Сяляне з дапамогай сервітутных зямель маглі ўтрымліваць больш жывёлы, чым з дапамогай надзельных зямель. Нават рускія памешчыкі, беручы падатак, дазвалялі карыстацца сялянам гэтым правам. У Заходняй Беларусі сервітутныя землі былі замацаваны яшчэ царскімі ўладамі спецыяльнымі граматамі. Аднак яны захоўваліся ў старастаў або іншых давераных асоб і з цягам часу згубіліся. Такім чынам, афіцыйных дакументаў на права карыстання гэтымі землямі ў сялян не было. У сельскай гаспадарцы заходнебеларускай вёскі пераважалі сервітуты, звязаныя з выганамі і выпасамі, іх было прыблізна 60%, пад астатнія адводзілася 40% [8]. Гэта было зразумела, таму што спецыялізацыяй сельскай гаспадаркі Заходняй Беларусі яшчэ з часоў Расійскай імперыі была мяса-малочная вытворчасць. Акрамя таго, насельніцтву у некаторых выпадках належала права збору грыбоў, ягад, нарыхтоўка дроў у лясах, якія належалі памешчыку, але знаходзіліся на сервітутных землях. Становіцца зразумелым, чаму сяляне не маглі адмовіцца добраахвотна ад выганаў і пашы.

Пад лозунгам ліквідацыі перажыткаў феадалізму польскія ўлады імкнуліся пазбавіць вяскоўцаў шматвекавога ўкладу і павялічыць свае зямельныя надзелы. Атрымаўшы ў 1920 годзе першы закон аб ліквідацыі сервітутаў, памешчыкі пачалі метадычна выцясняць сялян з гэтай зямлі. Першапачаткова заканадаўчы акт распаўсюджваўся толькі на цэнтральныя ваяводствы. Толькі ў 1922 годзе яго дзеянне распаўсюдзілася на Заходнюю Беларусь [10].

Ліквідацыя сервітутаў прадугледжвалася як добраахвотная, так і прымусовая. Памешчыкі заклікалі "... да максімальна хутчэйшай ліквідацыі сервітутаў" [8]. Для прымусовага адхілення сялян ад карыстання сервітутнымі ўгоддзямі дастаткова было заявы адной зацікаўленай асобы. Амаль заўсёды такой асобай выступаў памешчык. Па яго ініцыятыве вясковыя жыхары страчвалі права карыстання выпасам.

***Табліца 1*** – Наяўнасць сервітутаў (па дадзеным перапісу 1921 г.) (складзена на аснове Rocznik statystyczny spyidzelni rolniczych)

| Ваяводства | Кол-ць маёнткаў, якія мелі сервітут | Колькасць сялянскіх гаспадарак, якія карысталіся сервітутамі | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | лясным і | пашавымі |ляснымі і пашавымі | іншымі | Усяго |
| Беластоцкае | 202 | 524 | 2550 | 1594 | 58 | 4726 |
| Віленскае | 230 | 2226 | 5374 | 1949 | 58 | 9607 |
| Навагрудскае | 186 | 2350 | 5201 | 1383 | 321 | 9255 |
| Палескае | 148 | 2895 | 14995 | 4089 | 28 | 2007 |
| Усяго | 766 | 7995 | 28120 | 9015 | 465 | 45595 |

Па дадзеных перапісу 1921 года (табліца 1), звесткі аб сервітутных землях склалі толькі 766 памешчыцкіх маёнткаў [8]. Аднак многія з іх утойвалі наяўнасць сервітутаў, таму звесткі прыблізныя. Утойванне дадзеных было выклікана тым, што памешчыкі ўсімі магчымымі і немагчымымі спосабамі імкнуліся ўключыць гэтыя землі ў склад сваіх. Так, па падліках палескага ваяводы, на тэрыторыі беларускіх паветаў на Палессі было 590 сервітутаў. Там сялянству належала 575,4 тыс. га зямлі, а сервітуты складалі 1347 тыс. га, што амаль у два разы перавышала плошчу ворыўнай зямлі [7]. Становіцца зразумелым імкненне памешчыкаў уключыць гэтыя землі ў склад сваіх. У такім становішчы знаходзілася амаль ўсё сялянства краю. Па афіцыйных звестках, у Беластоцкім ваяводстве сервітуты мелі 20,9 %, у Віленскім – 9,1 %, у Навагрудскім – 14,9 %, у Палескім – 17,3 % усіх буйных гаспадарак [8]. Аднак гэтыя лічбы, магчыма, значна заніжаны. Улічваючы гэта, можна гаварыць, па меншай меры, пра паўтара мільёна гектараў сервітутных зямель. Таму так важна было сялянству гэтыя землі захаваць за сабой. Скасаванне права сялян на сервітуты пры недастатковасці ўласнай пашы магло прывесці да сельскагаспадарчага крызісу.

З прычыны гэтага актуальным станавілася пытанне аб адносінах паміж рознымі слаямі вясковага насельніцтва, паміж тымі, якія валодалі сервітутнымі ўгоддзямі, і тымі, хто іх не меў.

Так, прадугледжвалася кампенсацыя за ліквідаваны сервітут у выглядзе прырэзкі да сялянскага надзелу пэўнага ўчастка ворнай зямлі, але гэты надзел падзяляўся паміж сялянамі ўсёй вёскі і такім чынам памер яго аказваўся нязначным. Акрамя таго, гэты участак даваўся на адлегласці ад асноўнага сялянскага надзела, што павялічвала і без таго вялікую цераспалосіцу сярод вясковага насельніцтва. Разам з тым памешчыкі імкнуліся рознымі спосабамі пазбавіць сялян і гэтай нязначнай прырэзкі.

Аднак некаторым катэгорыям вясковага насельніцтва ліквідацыя сервітутаў была выгаднай. У першую чаргу гэта былі заможныя сяляне, якія атрымлівалі кампенсацыю ў выглядзе прырэзкі да сваіх надзелаў.

Тое, што ліквідацыя сервітутаў ажыццяўлялася прымусовымі метадамі, пацвярджае дэкларацыя БСРГ. У ёй гаварылася: "У выпадках спрэчак памешчыкі звяртаюцца ўжо не ў суд, як гэта было прынята раней, а ў адміністрацыйныя органы. У выніку на месца канфлікту з'яўляецца паліцыя, якая прапануе сялянам прызнаць правы памешчыка... Калі ж яны не падпарадкоўваюцца загадам, паліцыянты страляюць, б'юць, здзекуюцца, выклі-

каючы адмоўную рэакцыю з боку насельніцтва. Гэта бясправуе ў Заходняй Беларусі набывае ўсеагульны характар, вяртаючы яе ў часы прыгоннага права" [2]. Любыя дзеянні супраць паліцыі кваліфікаваліся як бунт.

Такім чынам, ужо ў 1922 годзе сервітуты былі адабраны ў жыхароў Новай Вёскі Нягневіцкай воласці (46 дзесяцін), сяла Кольчыцы Шчорсаўскай воласці (96 дзесяцін), вёсак Халаймаўшчына Свержанскай воласці Стаўбцоўскага павета, Юрэвічы Паланецкай воласці Баранавіцкага павета, і многіх іншых вёсак [3].

Вельмі часта замест адабраных сервітутаў сялянам давалі іншыя ўчасткі зямлі. Так, жыхары вёскі Белавічы Косаўскага павета замест адабранага ўрочышча ў дзве тысячы гектараў атрымалі іншы ўчастак у 225 га, г. зн., у дзевяць разоў меншы і, акрамя таго, аддалены. У выніку гэтых махінацый сяляне не маглі ім карыстацца, і зямля адышла да памешчыка [3]. У гэтым жа самым павеце такія дзеянні былі праведзены з жыхарамі вёсак Хрышчановічы і Квасевічы [3].

Знясіленыя барацьбой з памешчыцкім свавольствам, сяляне звярталіся ў дзяржаўныя судовыя органы. Аднак і тут іх чакала расчараванне. Улады прымалі бок памешчыкаў. Прыкладам гэтага можа паслужыць выпадак, які меў месца ў маёнтку Чарнёва. Памешчык Халкоўскі, распрадаючы зямлю, адначасова прадаў і сервітут вёскі Дарохі Гарадоцкай воласці Маладзечанскага павета. Калі ж новы гаспадар прыехаў араць купленую зямлю, сяляне не дазволілі яму гэтага зрабіць [3]. У дапамогу памешчыку былі высланы паліцэйскія сілы з Гарадоцкага і Караблянскага аддзяленняў. Аднак гэта не спалохала сялян. Толькі прымяніўшы сілу, карнікі змаглі зламаць супраціўленне жыхароў вёскі.

Захоп памешчыкамі сервітутных зямель у Заходняй Беларусі (акрамя Палесся) прыняў масавы характар у 1924-1926 гг. Тут, па афіцыйных дадзеных, гэты працэс пачаўся толькі ў 1927 г. За гэты час у сялян былі адабраны дзесяткі тысяч гектараў зямлі. Увогуле за час правядзення рэформы з 1919 па 1939 г. было ліквідавана ад 2 500 да 3 000 сервітутаў. Ад гэтага пацярпела звыш 134 тыс. сялянскіх гаспадарак (38,5 %). Узамен яны атрымалі толькі 200 тыс. га зямлі з 1 300 тыс. ліквідаваных сервітутных зямель. Сяляне былі вымушаны за карыстанне выганам аддаваць памешчыку і асадніку сельскагаспадарчыя прадукты ці разлічвацца адпрацоўкамі [8].

Сярод архіўных дакументаў быў знойдзены ліст селяніна вёскі Калодчына Вілейскага павета, у якім гаварылася, што "людзі на самай справе пакутуюць пад цяжасцю свайго цяперашняга сацыяльна-палітычнага становішча. У нас насельніцтва вельмі малазямельнае, на 2-3 дзесяцінах ворыўнай зямлі жывуць па 8-10 душ. Да гэтага часу за выпас скацiны плацілі мясцоваму памешчыку Гецэвічу маслам і яйкамі, зараз жа маёнтак падзелены паміж асаднікамі, якія атрымалі па 10-15 дзесяцін зямлі. Асаднік за выпас патрабуе адпрацоўваць – араць пар, касіць. Развалілася хата – будаваць новую і не думай: няма лесу. А тут яшчэ і падаткі напіраюць. Не паспееш заплаціць адзін, глядзіш – ужо выдадзены другі; то на гміну, то на сеймік, то на адміністрацыю, то на школу, то на зямлю, то яшчэ бог ведае на што…" [4]. Аб яшчэ адным прыкладзе свавольства памешчыкаў і асаднікаў гаворыцца ў справе ліквідацыі сервітута ў Нясвіжскім павеце: "Асаднік капітан Стылінскі захапіў сервітутны луг, які належыць сялянам вёскі Кахановічы Нясвіжскага павета. Пагражаючы зброяй, асаднік не дапускае сялян пасвіць жывёлу на сервітутнай зямлі" [6]. У скарзе паслоў міністру зямельных рэформ ад 27 мая 1924 г. гаварылася: "З часоў адмены прыгоннага права сяляне вёскі Зарэчча Нясвіжскага павета карысталіся сервітутным выпасам маёнтка "Зарэчча". Пасля захопу беларускіх зямель пачалася каланізатарская палітыка на гэтай тэрыторыі, і ў першую чаргу была распачата парцэляцыя ўзгаданага маёнтка для ваенных асаднікаў. У сувязі з парцэляцыйнымі працамі сяляне вёскі Зарэчча звярталіся да павятовай зямельнай управы з просьбай пакінуць сервітутны выпас для жывёлы. Зямельная ўправа абяцала выканаць іх пажаданне, аднак у выніку аказалася, што асаднікі ўвогуле забаранілі карыстацца выпасам" [4].

Такіх прыкладаў самавольства і грабяжу каланізатараў у заходнебеларускай вёсцы было шмат. Зямельная рэформа па ліквідацыі сервітутаў яшчэ больш падарвала эканамічнае становішча вёскі. Усе расходы, звязаныя з ліквідацыяй цераспалосіцы, вялікім цяжарам леглі на плечы сялян (аплата працы землямераў, выдаткі на апісанне зямлі і інш.). Неабходнасць прымушала сялян ісці да памешчыка за пазыкай, а пасля прыходзілася выплачваць высокія працэнты, а за лес адпрацоўваць у памешчыцкай гаспадарцы або расплачвацца грашыма. Такія ўмовы рабілі немагчымым набыццё вяскоўцамі сервітутных зямель, а гэта вяло да скарачэння колькасці жывёлы ў сялян.

Ліквідацыя шматвекавых устояў грамадства прынесла селяніну далейшае збяднenne і галечу. Польскія ўлады гэтага або не разумелі, або не хацелі разумець. Інакш чым можна растлумачыць факт абыякавых адносін з іх боку да заяў сялян. Нежаданне ўрадавых колаў вырашаць надзённыя пытанні цывілізаваным спосабам вяло да яшчэ больш глыбокай дыферэнцыяцыі вёскі, паглыбленне крызісных з'яў унутры польскага грамадства. Менавіта з гэтай прычыны сярод вясковага насельніцтва пастаянна адбываліся бунты і пагромы. У сярэдзіне 1923 года солтыс Сіманюк заклікаў жыхароў навакольных вёсак Алтушскай воласці Брэсцкага павета ісці ў лес, які ім належыў. Аднак на

гэту тэрыторыю прэтэндаваў інжынер Май-Мескулаў. Справа скончылася тым, што паліцыянты і інжынер былі выгнаны з лесу [8].

Правядзенне дадзенай рэформы пагоршыла і без таго цяжкі стан заходнебеларускай вёскі. Па дадзеных статыстыкі, да 1938 г. не менш 115,7 тысяч сялянскіх гаспадарак былі пазбаўлены права карыстацца сервітутнымі землямі [10]. На жаль, польская афіцыйная статыстыка не дае дакладных звестак аб плошчы ўгоддзяў, адабраных у сялян. Па польскіх статыстычных звестаках на, 1930-1931 гг. па Заходняй Беларусі было ліквідавана звыш 750 тысяч га сервітутных зямель [10]. У матэрыялах А.А. Сарокіна ідзе гаворка аб ліквідацыі прыкладна каля паўтара мільёна гектараў сервітутных угоддзяў, аднак у якасці кампенсацыі сяляне атрымалі крыху больш 200 тыс. га [8]. Такім чынам, яны згубілі ў 7 разоў больш, чым набылі.

## Высновы

Трэба адзначыць, што малазямельныя сяляне былі супраць лівідацыі сервітутаў на такіх умовах, выступалі за захаванне права карыстацца імі, таму што зямля якая давалася ім у выглядзе кампенсацыі была дрэннай якасці, або гэтыя надзелы знаходзіліся далёка ад месцажыхарства сялян. Ліквідацыя сервітутнага права напрамую была звязана з парушэннем правоў землекарыстання не толькі беларускага селяніна-бедняка, але нават і серадняка, які не мог разлічваць на дастатковую кампенсацыю у выглядзе прырэзак да сваіх надзелаў.

Адначасова ліквідацыя сетвітутнага права паскарала пранікненне капіталістычных адносін у вёску, садзейнічала развіццю таварна-грашовых адносін сярод розных катэгорый вясковага насельніцтва не толькі Заходняй Беларусі, але і II Рэчы Паспалітай у цэлым, тых катэгорый сялян, якія атрымалі прырэзкі, або прадавалі ці апрацоўвалі яе. Значна большую выгаду ад ліквідацыі сервітутаў атрымлівалі памешчыкі, якія пасля атрымання поўнага права на сервітутныя землі маглі прадаваць іх тым жа сялянам, але па рыначных цэнах, а калі гэта былі лясныя угоддзі, то прадаваць драўніну, або прадаваць канцэсіі на распрацоўку замежным манапалістам.

### *Бібліяграфічны спіс*


1. ДАБВ (далей ДАБВ) Фонд 1, Воп. 9, Спр. 764 Справаздача Палескага паліцэйскага ваяводскага ўпраўлення аб дзейнасці Бунда на тэрыторыі ваяводства.
2. ДАБВ Фонд 1, Воп. 9, Спр. 1806 Палітычная адозва БСРГ з нагоды святкавання 5-гадовага юбілея з дня заснавання ад 2 лістапада 1931 г.
3. ДАБВ Фонд 60, Воп. 1, Спр. 1130 Справаздача аб ліквідацыі сервітутаў і правядзенні хутарызацыі зямель на тэрыторыі Палесскага акружнога зямельнага упраўлення за 1922 г.
4. ДАБВ Фонд 372, Воп. 7, Спр. 69 Цыркуляр Міністэрства сельскай гаспадаркі аб землеўладкаванні, звесткі аб ліквідацыі сервітутаў, спісы дзяржаўных маёнткаў на тэрыторыі Пінскага павета.
5. ДАБВ Фонд 667, Воп. 1, Спр. 2 Заявы грамадзян аб выдачы дазволу на пакупку зямлі ў маёнтку Бортнікі.
6. Дзяржаўны архіў Гродзенскай вобласці Фонд 571, Воп. 1, Спр. 4 Справа аб ліквідацыі сервітута вёскі Кахановічы Нясвіжскага павета.
7. Кухарев, Б.Е. Сельское хозяйство Белоруссии (1919 – 1939 гг.) / Б.Е.Кухарев. – Мінск: Вышэйшая школа, 1975 – 110 с.
8. Сорокин, А.А. Аграрный вопрос в Западной Белоруссии (1920 – 1939 г.) / А.А. Сорокин. – Минск: Наука и техника, 1968 – 200 с.
9. Belcikowski, J. Stronnictwa, Partje, Unje, Federacje, Kluby Polityczne w roku 1921 / J. Belcikowski. – Warszawa – Lwow: Dom Ksi№ki Polskiej, 1922 – 56 s.
10. Gomylka K. Bialorusini w II Rzeczypospolitej / K. Gomylka. – Gdacsk: Wydaw. PG, 1992 – 178 s.
11. Gomylka K. Mikdzy Polska a Rosia: Bialoruњ w koncepcijach polskich ugrupowac politzcznych 1918-1922 / K. Gomylka. – Warszawa: Gryf, 1994 – 263 s.
12. Witos, W. Wybyr pism i myw / W. Witos. – Lwyw. Dom Ksi№ki Polskiej, 1939 – 56 s.


*Поступила 08.09.08*